*Я.А. Гараднiцкi,*
*дацэнт кафедры беларускай*
*фiлалогii i сусветнай лiтаратуры*
*Беларускага дзяржаўнага ўнiверсiтэта*
*культуры i мастацтваў,*
*кандыдат фiлалагiчных навук*

# КНIГА – ТВОР – ТЭКСТ
## (тэкстуальны аналiз i iнтэрпрэтацыя ў працэсе навучання)

Асноўнай крынiцай вывучэння студэнтамi лiтаратуры з'яўляюцца тэксты твораў, якiя ў найбольш адэкватным выглядзе рэпрэзентуюць пэўную гiсторыка-культурную эпоху, мастацкi напрамак, стыль i жанр. Непасрэднае знаёмства з тэкстамi, уважлiвае прачытанне праграмных твораў з'яўляецца неабходнай умовай глыбокага засваення вучэбнага матэрыялу, гарантыяй таго, што гiсторыя лiтаратуры будзе ўспрынята ў яе найбольш выразных i характэрных рысах, у паўнаце яе цэласнага мастацкага ўвасаблення.

Чытанне твораў мастацкай лiтаратуры ў працэсе яе вывучэння мае спецыфiчны характар, сваiмi метадалагiчнымi ўстаноўкамi яно значна адрознiваецца ад звычайнага чытання, не абцяжаранага дыдактычнымi мэтамi. Гэта, вядома, не азначае, што такiм чынам страчвае сваю актуальнасць фактар эстэтычнага задавальнення. Неабходна якраз падкрэслiць важнасць эстэтычнага аспекту засваення лiтаратуры, паколькi ён з'яўляецца адным з вiдаў мастацтва i аказвае адпаведнае ўздзеянне на рэцыпiента сваёй мастацкай формай, спосабамi мастацкага выражэння.

Трэба прызнаць, што яшчэ даволi часта эстэтычныя ўласцiвасцi i функцыi мастацкай лiтаратуры не ў дастатковай ступенi ўлiчваюцца ў працэсе навучання. Калi студэнт не валодае дастатковымi навыкамi спасцiжэння шматзначнасцi лiтаратурнага твора, аналiзу яго асноўных мастацкiх узроўняў i элементаў, ён успрымае твор выключна як крынiцу iнфармацыi. Да таго ж iнфармацыя ў гэтым выпадку звычайна зводзiцца да абазначэння падзейнага боку, арыентавана ў першую чаргу на выяўленне фабульнай асновы твора.

Адной з галоўных перашкод на шляху глыбокага спасцiжэння эстэтычных вартасцей лiтаратурнага твора з'яўляецца эфект так званага «наiўнага чытання», калi выдуманы мастацкi свет твора, па сутнасцi, атаясамлiваецца з рэальнасцю. У сувязi з гэтым асаблiвае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

значэнне набывае ў літаратуразнаўстве катэгорыя мастацкага свету. Апошнім часам назіраецца тэндэнцыя надання гэтаму паняццю большай тэрміналагічнай выразнасці. Мастацкі свет літаратурнага твора – гэта ўсё, што складае прадметную аснову выяўленага ў творы, што становіцца аб'ектам успрымання чытачом. А значыць, тое, пра што гаворыцца і што выяўляецца ў творы, неаддзельна ад спосабаў
і сродкаў яго вобразнага, мастацкага ўвасаблення.

Мастацкі свет літаратурнага твора – свет віртуальны. Ён непасрэдна залежыць ад суб'екта ўспрымання, таму што толькі ў свядомасці і ўяўленні рэцыпіента ён можа рэалізавацца, прадстаць у пэўных формах. Такі напрамак гуманітарных даследаванняў, як рэцэптыўная эстэтыка, займаецца якраз вывучэннем ролі чытача ў адзіным працэсе тварэння/рэцэпцыі, зыходзячы з палажэння аб чытачы як сутворцы аўтара. Даследаванні рэцэптыўнай эстэтыкі паказалі, што фактар чытача адыгрывае важную ролю яшчэ ў працэсе фарміравання і здзяйснення творчай задумы аўтара. Істотнае значэнне ў выяўленні ідэйна-мастацкіх дамінант літаратурнага твора мае арыентацыя аўтара на так званага «імпліцытнага чытача», г. зн. арыентацыя на адпаведны ўзровень чытацкай падрыхтаванасці, чытацкіх інтарэсаў, на «гарызонты чаканняў чытача».

Разам з тым неабходна мець на ўвазе, што сама магчымасць успрымання абумоўлена перш за ўсё існаваннем канкрэтнага тэксту, які належыць пэўнаму аўтару. Без гэтай першаснай умовы наогул страчвае ўсялякі сэнс размова пра мастацкі свет, спосабы яго ўспрымання і прынцыпы інтэрпрэтацыі. Метадалогіяй постструктуралісцкага даследавання прадугледжваецца шматстайнасць інтэрпрэтацый аднаго твора, магчымасць markedнага яго прачытання ў залежнасці ад суб'ектыўнага ўспрымання рэцыпіента. Аднак усе гэтыя інтэрпрэтацыі абмяжоўваюцца і накіроўваюцца ўсё-такі тым, што закладзена ў самім творы, што ўяўляе сабой пэўны семантычны код, які патрабуе адпаведнай расшыфроўкі. Таму пры звароце да праблемы ўспрымання літаратурных твораў варта ўлічваць таксама і вопыт структурна-семіятычных даследаванняў. Шмат у гэтым напрамку зрабіў Ю. М. Лотман, заснавальнік Тартускай структурна-семіятычнай школы, які слушна падкрэсліваў, што «знакавая прырода мастацкага тэксту двaістая ў сваёй аснове». Гэтая двaістасць заключаецца ў тым, што, «з аднаго боку, тэкст прыкідваецца самой

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэальнасцю, прыкідваецца маючым самастойнае быццё, незалежнае ад аўтара, рэччу сярод рэчаў рэальнага свету. З другога – ён пастаянна нагадвае, што ён чыёсьці тварэнне і нешта значыць» [2, с. 69].

Пры дапушчэнні адноснай свабоды інтэрпрэтацый мастацкага твора ў працэсе навучання неабходна ўлічваць перш за ўсё яго тэкстуальныя асаблівасці, паколькі менавіта праз іх выяўляюцца канцэптуальнасць аўтарскай задумы, сэнсавыя глыбіні падтэксту, ідэйна-мастацкая цэласнасць твора. Тэкстуальны аналіз не толькі дае магчымасць раскрыцця значэння паасобных кампанентаў мастацкай формы, але з’яўляецца таксама неабходнай стадыяй на шляху да сінтэзу, ён прыводзіць у канчатковым выніку да абагульненага ўспрымання літаратурнага твора як цэласнасці.

Пад уплывам структуралісцкіх і постструктуралісцкіх тэорый у другой палове ХХ ст. значна ўзмацнілася ўвага да тэксту як выяўлення агульных заканамернасцей працэсу пісьма. Гэта катэгорыя пачала дамінаваць у гуманітарных даследаваннях, у пэўным сэнсе ўзвышаючыся над такімі традыцыйнымі паняццямі, як аўтар і твор. Для апалагетаў падобных падыходаў становіцца, па сутнасці, неістотным аўтарскі пачатак, які элімінуецца з тэкставай прасторы. Аўтар з яго жыццёвым вопытам, светапоглядным кругаглядам, з усім тым, што складае адметнасць пэўнай гістарычнай эпохі, выносіцца як бы за дужкі даследаванняў, сканцэнтраваных на аналізе тэксту і яго іманентных уласцівасцей.

Менавіта таму існуе неабходнасць у размежаванні тэрмінаў ***твор*** і ***тэкст***, выяўленні ў працэсе вывучэння літаратуры адрозненняў у семантыцы і функцыянаванні гэтых паняццяў. «Твор» і «тэкст» не тоесныя адно аднаму паняцці, паколькі твор уключае ў сябе і аўтарскія інтэнцыі, і жыццёвы і літаратурны кантэкст, у якім адбывалася яго фарміраванне. Апошнім часам у літаратуразнаўчай навуцы і крытыцы заўважаецца якраз вяртанне да больш актыўнага карыстання тэрмінам «твор», у які ўкладваецца шырокі спектр значэнняў. Сучасныя даследчыкі абапіраюцца на ідэі М. М. Бахціна, яго тэорыю дыялагізму, паводле якой сутнасць славеснага твора выяўляецца праз узаемадзеянне розных «галасоў», свядомасцей, пунктаў гледжання. Твор гэта адкрытая сістэма, якая будуецца на дыялагічнай супрацьпастаўленасці суб’ектаў свядомасці – «Я» і «Іншага».

Значны ўклад у распрацоўку тэорыі суб’ектнай арганізацыі твора зрабіў Б. В. Корман, выдатны расійскі літаратуразнавец, які ў свой

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

час займаўся даследаваннем і беларускай літаратуры, у прыватнасці творчасці Максіма Багдановіча. Пад суб’ектнай арганізацыяй Корман разумее «суаднесенасць усіх урыўкаў тэксту, якія ўтвараюць дадзены твор, з суб’ектамі маўлення – тымі, каму прыпісаны тэкст (фармальна-суб’ектная арганізацыя), і суб’ектамі свядомасці – тымі, чыя свядомасць выражана ў тэксце (змястоўна-суб’ектная арганізацыя)» [1, с. 213].

Успрыманне твора як выніку ўзаемадзеяння суб’ектна-аб’ектных адносін значна паглыбляе нашы веды пра структуру твора, дае магчымасць паглядзець на літаратурны твор як на складаную мастацкую мадэль, якая, не дубліруючы рэчаіснасць, выяўляе ў той жа час сутнасныя, анталагічныя асновы быцця. Адным з важнейшых пытанняў метадалагічнага характару з’яўляецца пытанне аб суадносінах пры вывучэнні літаратуры гісторыка-фактаграфічнага матэрыялу і тэарэтычных абагульненняў. Безумоўна, надзвычай важна ў працэсе засваення літаратурных крыніц успрымаць іх ва ўсёй непасрэднасці эстэтычнага ўздзеяння, моўна-стылёвай увасобленасці і завершанасці. Аднак разуменне мастацкай вартасці твора залежыць таксама ў значнай ступені і ад таго, наколькі выразна ўспрымае чытач паэтыку твора, яго структурныя, кампазіцыйныя ўзаемазалежнасці. Веданне таго, як «зроблены» твор, патрэбна не толькі даследчыку літаратуры, але ў пэўнай ступені і звычайнаму чытачу, таму, хто імкнецца засвоіць усё эстэтычнае багацце літаратуры.

Падыход, напрыклад, да славутага рамана Івана Мележа «Людзі на балоце» з яго цыкла «Палеская хроніка» як да твора паліфанічнага, які змяшчае ў сабе, апрача аўтарскага пункту гледжання, шматгалоссе многіх іншых суб’ектаў свядомасці, можа значна паглыбіць разуменне гэтага шэдэўра беларускай літаратуры XX ст. Апавядальная манера, характэрная для твора, дае магчымасць выразна адчуць не толькі стылёвую шматфарбнасць, але і паўнату ўвасаблення ў агульнай плыні людскіх лёсаў, выразную адметнасць кожнага персанажа. Пры ўважлівым чытанні рамана можна заўважыць, што самабытная мова, на якой гавораць мележаўскія героі, з’яўляецца не проста стылёвым аздабленнем. У кожным выпадку індывідуалізаваная, характэрная, сітуацыйна дастасаваная, яна выразна акрэслівае ментальныя абрысы персанажаў, межы іх духоўнай прасторы і ў той жа час сведчыць пра глыбіннае адзінства і цэльнасць народнага быцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*1. Корман, Б. О.* Избранные труды. Теория литературы / Б. О. Корман. – Ижевск : Ин-т компьютерных исслед., 2006. – 552 с.
*2. Лотман, Ю. М.* Семиосфера / Ю. М. Лотман. – СПб. : Искусство-СПб, 2001. – 704 с.
РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ